З 26 па 28 верасня ў Бярэзінскім раёне Мінскай вобласці адбыўся Рэспубліканскі турысцкі злёт студэнтаў у рамках Рэспубліканскай універсіяды — 2021. 19 УВА з усёй краіны, больш за 350 удзельнікаў 3 дні спаборнічалі ў спартыўнай і конкурснай праграме.



# Свята турызму

У першы дзень удзельнікі дэманстравалі свае творчыя здольнасці ў конкурсе візітовак каманд. Каманды прадстаўлялі свае ўстановы адукацыі, расказвалі аб інтарэсах і захапленнях удзельнікаў. Суддзям неабходна было ацаніць інфарматыўнасць, турыстычную тэматыку, арыгінальнасць, артыстычнасць, маляўнічасць афармлення выступлення і якасць музычнага суправаджэння. Пры сур'ёзнай канкурэнцыі 1-е месца заваявала каманда Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, тым самым адкрыўшы лік сваіх перамог у праграме злёту.

27 верасня ўсе турысты адзначалі Міжнародны дзень турызму. Гэтае свята стала самым напружаным днём злёту. Спаборніцтвы па спартыўным арыентаванні, тэхніцы пешаходнага і веласіпеднага турызму праходзілі паралельна адно з адным і з конкурсамі турысцкіх навыкаў і быту, конкурсам на лепшую турыстычную газету "Будні злёту". Абсалютным пераможцам ва ўсіх відах спартыўнай праграмы стаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры. На працягу многіх гадоў ён застаецца бясспрэчным лідарам, тым самым пацвярджаючы сваё заслужанае званне самай спартыўнай УВА краіны. Дастойную канкурэнцыю ў спартыўнай праграме прадэманстравалі таксама Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт і інш.

У конкурсе турысцкіх навыкаў і быту, які павінен быў вызначыць лепшую каманду ў арганізацыі турысцкага быту, судзейская каманда назвала чатырох пераможцаў, сярод якіх асабліва адзначыла здольнасць каманды Інстытута пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь арганізаваць сабе ўтульнасць у любых пагодных умовах.

Завяршыўся дзень конкурсам турыстычнай песні "Спяём, сябры". Па выніках выканання дзвюх песень на турыстычную і патрыятычную тэматыку перамогу атрымала каманда Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Па балах нязначна ім саступіла выключна артыстычная каманда Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт і інш.

У рамках турысцкага злёту адбыўся адкрыты дыялог "Рэалізацыя студэнцкіх ініцыятыў на сучасным этапе". Дыялог з моладдзю вялі другі сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Прохараў і намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі — начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Таццяна Анатольеўна Сіманоўская.

У заключны дзень прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і прызёраў злёту. 3-е месца ў агульным заліку заняла каманда Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, 2-е — каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, 1-е — каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры.

Падводзячы вынікі, можна з упэўненасцю сцвярджаць — свята турызму ўдалося! Азарт спартыўнай барацьбы, добры настрой, новыя знаёмствы і песні ля вогнішча назаўсёды застануцца ў памяці ўдзельнікаў злёту!

**Марыя ГОЛУБЕВА,**
**загадчык аддзела турызму і спартыўнага арыентавання Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства.**
**Фота аўтара.**